# <u>Алімпіядныя заданні</u>

Лінгвістычны конкурс

Марфалогія

Х клас

*Заданне 1. Што лішняе сярод слоў адпаведнага радка? Назваць прычыну (прымету, якасць, асаблівасць), па якой слова лічыцца лішнім.*

1. Азёры, воблакі, вокны, вароты, вушы.
2. Гуляка, калека, сястра, плакса, соня.
3. Смелы, зялёны, дужы, смачны, босы.
4. Восень, гусь, радасць, боль, рунь.
5. Свой, іхні, наш, іншы, мой.
6. Бо, каб, як, ды, калі.
7. Жыць, біць, пячы, піць, есці.
8. Дэпо, метро, кіно, акно, трыо.
9. Адзінка, пяцёрка, тысяча, дзесятка, сотня.

*Заданне 2. Запісаць назоўнікі ў форме роднага, давальнага, творнага склонаў.*

Янка Купала, задзіра (ён, яна), дождж, верф, Свіцязь, сяло Барадзіно, кампазітар Барадзін, з'езд (з гары на лыжах), з'езд (канферэнцыя), шынель, атэізм, Об, Сібір, Жэня (хлопчык, дзяўчынка).

*Заданне 3. Запісаць лічэбнікі ў форме творнага склону.*

5; 11; 16; 18; 20; 37; 78; 203; 504; 800; 1002; 3 3/4; 2,03; 0,08.

*Заданне 4. Раскрываючы дужкі, пастаўце займеннікі ў патрэбную форму.*

Пры (ты), да (ты), да (хто-небудзь), з (абы-хто), у (абы-які), з (ніхто), пры (хтосьці), пры (хто-небудзь), па (якісьці), у (абы-што), з (ён сам), да (ён сам), да (самы), у (хтосьці).

*Заданне 5. Якім членам сказа выступае дзеяслоў-інфінітыў?*

1. Дружбакі пакрочылі да возера *купацца.*
2. Яшчэ была надзея *вырвацца* з акружэння.
3. Жаданне *ладзіць* новы лад сюды іх прывяло.
4. *Вучыцца* - справа няпростая.
5. Я даў слова *дапамагчы* сябру ў вучобе.
6. Міхась пайшоў *перагаварыць* з кіраўнікам аб заўтрашнім паходзе.
7. Летам я буду *працаваць* важатым у дзіцячым летніку.

*Заданне 6. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.*

Кубанская степь, розовый шиповник, зубастая щука, спелая земляника, охотничья собака, черный рояль, крепкий кофе, огромный жираф, зеленый салат, серый гусь, надежное средство, одна бровь, сочное яблоко, новый кафель, вкусная селедка.

*Заданне 7. Знайдзіце сказы з памылкай ва ўтварэнні або напісанні дзеепрыметнікаў. Запішыце сказы правільна.*

1. Налітыя сокам, каласы схіліліся долу і, абмытыя вячэрняй расой, яшчэ больш пацяжэлі. 2. Ігнат быў надзвычай ўраўнаважаны, унутрана сабраўшыйся. 3. Мімаволі падкасіліся ногі, і Анісся прыхілілася да заснежынага плота, каб аддыхацца. 4. Каля брамы сядзела сагнуўшаяся худая жанчына сярэдніх гадоў. 5. Захоплены ідэямі гуманізму, Скарына ўзяўся за нялёгкую, але пачэсную справу выдання кніг на роднай мове. 6. Забалочаная паляна, акружаная з усіх бакоў сцяною лесу, млела ад гарачыні. 7.Праходзячыя міма людзі здзіўлена пазіралі на нас. 8. Насупраць уваходу стаяў стол, накрыўшы белым абрусам. 9. Забаронена паляванне на самак, маючых маладняк. 10. Пракоп, унурыўшыся, слухае, а потым перастае сачыць за словамі Сцяпана, разважаючыга, як найлепш арганізаваць работу.

*Заданне 8. Выпішыце спачатку прыслоўі, якія пішуцца праз злучок, затым — спалучэнні, што пішуцца ў тры словы. З астатнімі спалучэннямі складзіце і запішыце словазлучэнні.*

Раз (по) раз, без (дай) прычыны, час (ад) часу, дзе (ні) дзе, дзень (пры) дні, мала (па) малу, не (ў) забаве, не (па) чалавечы, не (на) жарт, не (пад) сілу, шыварат (на) выварат, крыж (на) крыж, след (у) след, перш (на) перш, само (па) сабе, не (да) смеху, не (ў) папад, усё (ж) такі, душа (у) душу, сам (на) сам.

*Заданне 9. Вызначце, якой часцінай мовы з 'яўляюцца выдзеленыя словы.*

1. *Абапал* ішлі пералескі... 2. Сядзіць *сабе* ціхенькі кусцік зялёнага лісця. 3. Маладыя зялёныя лісці *ледзь* не дрыжэлі ад лёгкага ветрыка. 4. Спраўляючы свой карагод, Зямля *вакол* Сонца імчыцца... 5. Ніхто з сялян не будаваўся тут, *нягледзячы на* ўсе выгоды гэтай мясціны. 6. Гэта *проста* непаразуменне, мы ўсё высветлім. 7. *Пасля* доўгай ночы дзень прабіваўся праз маленькія аконцы паволі і нясмела. 8. *Гэта* ж я хацеў прасіць, можа б вы за сведку ў мяне былі. 9. Ён ведаў*, як* гэта рабіць. 10. Тую зямлянку *якраз* і сапёры мінулі.

*Заданне 10. Прачытаць сказы. Знайсці ў іх размоўныя формы назоўнікаў. Выправіць моўныя хібы.*

1. Увесь сельсавет ужо ведаў, што ў бальніцу прыехала новая доктарша. 2. Вольга працуе брыгадзіркай на тэкстыльным камбінаце. 3. Касірка ўжо пачала выдаваць грошы. 4. Пасля пераходу ў раённую газету Ірына Мікалаеўна зноў працуе рэдактаршай. 5. Дыктарша аб'явіла пачатак новай тэлеперадачы для юнацтва. 6. Лабарантка павінна адказваць за тэхнічнае абсталяванне кабінета.

Адказы на лінгвістычныя заданні ( X клас)

Заданне 1.

Лішнія словы.

1. Вароты - няма адзіночнага ліку, астатнія назоўнікі маюць адзіночны і множны лік.
2. Сястра - назоўнік жаночага роду, астатнія -агульнага.
3. Босы - гэты прыметнік не мае ступені параўнання, астатнія маюць.
4. Боль - назоўнік мужчынскага роду, астатнія -жаночага.
5. Іншы - азначальны займеннік, астатнія - прыналежныя.
6. Ды - злучальны злучнік, астатнія - падпарадкавальныя.
7. Есці - рознаспрагальны дзеяслоў, астатнія -І спражэння.
8. Акно - скланяльны назоўнік, астатнія - нескланяльныя.
9. Тысяча - лічэбнік, астатнія - назоўнікі.

Заданне 2.

*Родны склон*: Янкі Купалы, задзіры (м., ж.), дажджу, верфі, Свіцязі, сяла Барадзіна, кампазітара Барадзіна, з 'езду (з гары), з 'езда (канферэнцыі), шыняля, атэізму, Абі, Сібіры, Жэні (м., ж.).

*Давальны склон*: Янку Купалу, задзіру (м.), задзіры (ж.), дажджу, верфі, Свіцязі, сялу Барадзну, кампазітару Барадзіну, з 'езду, з 'езду, шынялю, атэізму, Абі, Сібіры, Жэню (м.), Жэні (ж.).

*Творны склон:* Янкам Купалам, задзірам (м.), задзірай (ж.), дажджом, верф'ю, Свіцяззю, сялом Барадзіном, кампазітарам Барадзіным, з'ездам, з'ездам, шынялём, атэізмам, Об'ю, Сібір'ю, Жэнем (м.), Жэняй (ж.).

Заданне 3.

Пяццю, адзінаццаццю, шаснаццаццю, васемнаццаццю, дваццаццю, трыццаццю сямю, сямюдзесяццю васьмю, двумастамі трыма, пяццюстамі чатырма, васьмюстамі, тысячай двума, трыма цэлымі трыма чацвёртымі, дзвюма цэлымі трыма сотымі, нулём цэлых васьмю сотымі.

Заданне 4.

Пры табе, да цябе, да каго-небудзь, з абы-кім, у абы-якога, ні з кім, пры кімсьці, пры кім-небудзь, па якімсьці, у абы-чаго, з ім самім, да яго самога, да самага, у кагосьці.

Заданне 5.

1. Дружбакі пакрочылі да возера купацца (з якой мэтай?- акалічнасцьмэты). 2.Яшчэ была надзея вырвацца (якая? - азначэнне) з акружэння. 3. Жаданне ладзіць (я кое? - азначэнне) новы лад сюды іх прывяло. 4. Вучыцца (ш т о і м е н н а? – дзейнік) — справа няпростая. 5. Дапамагчы – азначэнне. 6. Перагаварыць — акалічнасць. 7. Працаваць —

частка выказніка.

Заданне 6.

Кубанскі стэп, ружовая шыпшына, зубасты шчупак, спелыя суніцы, паляўнічы сабака, чорны раяль, моцная кава, вялізная жырафа, зялёная салата, шэрая гусь, надзейны сродак, адно брыво, сакавіты яблык, новая кафля, смачны селядзец.

Заданне 7.

2. Ігнат быў надзвычай ўраўнаважаны, унутрана *сабраны.* 3. Мімаволі падкасіліся ногі, і Анісся прыхілілася да *заснежанага* плота, каб аддыхацца. 4. Каля брамы сядзела *сагнутая* худая жанчына сярэдніх гадоў. 7. Людзі, *якія праходзілі міма*, здзіўлена пазіралі на нас. 8. Насупраць уваходу стаяў стол, *накрыты* белым абрусам. 9. Забаронена паляванне на самак, *якія маюць* маладняк. 10. Пракоп, унурыўшыся, слухае, а потым перастае сачыць за словамі Сцяпана, *які разважаў*, як найлепш арганізаваць работу.

Заданне 8.

*Праз злучок:* раз-пораз, дзе-нідзе, мала-памалу, не па-чалавечы, шыварат-навыварат, крыж-накрыж, перш-наперш, сам-насам.

*У тры словы*: без дай прычыны, час ад часу, дзень пры дні, не на жарт, не пад сілу, след у след, само па сабе, не да смеху, усё ж такі, душа ў душу.

*Словазлучэнні:* неўзабаве спраўдзілася, гаварыць неўпапад.

Заданне 9.

1. *Абапал* (прыслоўе) 2. *Сабе (*часціца) 3. *Ледзь* (часціца) 4. *Вакол (* прыназоўнік) 5. *Нягледзячы на* (прыназоўнік) 6. *Проста* (часціца) 7. *Пасля* (прыназоўнік) 8. *Гэта* ( часціца) 9. *Як* (прыслоўе) 10. *Якраз* ( часціца)

Заданне 10.

1. Увесь сельсавет ужо ведаў, што ў бальніцу прыехала новая доктар.

2. Вольга працуе брыгадзірам на тэкстыльным камбінаце. 3. Касір ўжо пачала выдаваць грошы. 4. Пасля пераходу ў раённую газету Ірына Мікалаеўна зноў працуе рэдактарам. 5. Дыктар аб'явіла пачатак новай тэлеперадачы для юнацтва. 6. Лабарант павінна адказваць за тэхнічнае абсталяванне кабінета.